На наш погляд, у першую чаргу мы павінны звярнуць увагу на дзяцей як на будучы інтэлектуальны і творчы патэнцыял рэспублікі. Калі ў дзяцінстве пачаць развіваць інтэлект і творчыя здольнасці, то мы можам атрымаць яркую, усебакова развітую асобу.

Магчымасць бібліятэк у галіне адукацыі, выхавання і творчай арганізацыі вольнага часу цяжка пера-ацаніць. Акрамя гэтага, бібліятэка мае такія магчы-масці, якія не мае ніводная ўстанова культуры і адукацыі, ніводны сродак масавай інфармацыі. У бібліятэку чытач прыходзіць таму, што адчувае неабходнасць у кнізе. Тэлебачанне, кінатэатры, дамы культуры прапануюць свой сённяшні рэпертуар. Бібліятэка можа прапанаваць чытачу любы твор, напісаны са старажытных часоў да нашых дзён.

Бібліятэка выконвае шэраг функцый: захоўвае духоўную спадчыну чалавецтва, распаўсюджвае яе ў часе і прасторы, служыць развіццю навукі і тэхнікі, літаратуры, з'яўляецца апорай для рэлігійнай, палітычнай, грамадскай дзейнасці, выкарыстоўваецца ў эстэтычным, этычным выхаванні, прафесійнай адукацыі насельніцтва.

Вельмі значная роля бібліятэкі ў развіцці інтэлекту. Па меркаванню вучоных, за кошт чытання інтэлект развіваецца на 90 % . Больш таго, як сведчыць Памела Спейс Рычардс, даследаванне ўплыву чытання на дзіцячую аўдыторыю паказала, што дзеці, якія ўзраслі на тэлевізійных перадачах, паказваюць такія ж цяжкасці ў галіне мысліцельнай дзейнасці, як і вучні каледжаў з непаўнацэннымі навыкамі інтэлектуальнага развіцця. Аднак дзіця, якое будзе толькі чытаць, не зможа стаць шматграннай асобай. Яму неабходна развіваць і творчыя задаткі ў гульні, маляванні, музыцы, скульптуры і г.д.

Зыходзячы з вышэйсказанага, мы мяркуем, што ёсць сэнс увесці ў нашым універсітэце спецыяльнасць «бібліятэкар-арганізатар інтэлектуальнай дзейнасці дзяцей». Спецыялісты гэтай спецыялізацыі павінны валодаць, акрамя іншага, методыкай выкладання музыкі, малявання, лепкі, шыцця, макрамэ і інш. Гэта не менш важна, чым інтэлектуальнае развіццё. На думку вядомага педагога Сухамлінскага, у дзяцінстве чалавек павінен навучыцца хоць адну справу рабіць добра. Гэта ў далейшым пазбавіць яго ад комплексу непаўнацэннасці.

На асобым палажэнні павінна быць майстэрства акцёра. Гульня ў дзяцінстве з'яўляецца адным са сродкаў пазнання свету. Разам з тым менавіта выхаванне акцёрскіх якасцей дапаможа выхаванню ў падлетка адэкватнага рэагавання на ўзнікаючыя неспрыяльныя сітуацыі, узмацніць і абагаціць эмацыянальныя рэсурсы і камунікацыйныя магчымасці чытача, дасць магчымасць развіць здольнасці да творчасці, выхаваць ў сабе валявыя якасці, здольнасць да самарэгулявання.

Зыходзячы з вышэйвыкладзенага мы мяркуем, што для студэнтаў дадай спецыялізацыі павінен быць вучэбны план.

Ён можа складацца з наступных блокаў дысцыплін:

1) агульнанавуковыя,
2) бібліятэчна-інфармацыйныя,
3) тэхналогія адукацыі і разнастайных відаў творчасці,
4) методыка развіцця інтэлектуальнай дзейнасці.

На наш погляд, такі спецыяліст зможа паспяхова працаваць ў якасці бібліятэкара дзіцячай, школьнай, юнацкай і публічнай бібліятэк. У яго дастаткова ведаў, каб на базе бібліятэкі арганізаваць гурток, аб'яднанне ці клуб па інтарэсах. Такі спецыяліст зможа быць таксама і гувернёрам, і выхавацелем у старшых групах дзіцячага сада і грамотна выхоўваць сваіх дзяцей.

Кузьмініч Т.В.,
аспірантка

## СПАЖЫЎЦЫ ГІСТАРЫЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ І ІХ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ПАТРЭБНАСЦІ

Атрыманне чалавекам інфармацыі як крыніцы ведаў аб навакольным асяроддзі з'яўляецца адной з асноўных яго патрэбнасцей. Даследаванне і разуменне любой з'явы грамадскага жыцця немагчыма без гістарычнага падыходу. Гісторыя вывучае мінулае чалавецтва ва ўсёй яго дакладнасці і разнастайнасці і робіць магчымым выяўленне заканамернасцей сучаснага развіцця грамадства.

Патрэбнасць у даследаванні гістарычнага мінулага характэрна для кожнага пакалення людзей, пры гэтым, чым больш значныя пераўтварэнні адбываюцца ў грамадстве, тым больш узрастае і паглыбляецца імкненне пераасэнсаваць мінулае. Па словах М.А.Бярдзяева, гістарычныя катастрофы і пераломы заўсёды выклікалі неабходнасць асэнсавання гістарычнага працэсу, пабудовы той ці іншай філасофіі гісторыі.

Імкненне да ўсебаковага і глыбокага асэнсавання мінулага спрыяе, з аднаго боку, актывізацыі цікавасці да вывучэння гістарычных крыніц (гістарычная інфармацыя апасродкавана гістарычнымі крыніцамі, якія засталіся ад пэўнай эпохі), з другога — рэзкаму павелічэнню дакументальнага патоку гістарычнай тэматыкі. Гэтым абумоўлена ўзрастанне ролі крыніц другаснай інфармацыі і адпаведна патрабаванняў да іх. Шляхі ўдасканалення сістэмы другаснай інфармацыі гістарычнай тэматыкі могуць стаць больш акрэсленымі пры ўмове дэталёвага вывучэння дакументальнага патоку галіны і інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў.

Даследаванне каналаў інфармацыя--спажывец, фарміраванне інфармацыйных патрэбнасцей і асаблівасці іх задавальнення былі аб'ектам разгляду ў шэра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гу публікацый. Вывучэнне спажыўцоў гістарычнай інфармацыі вялося звычайна ў сукупнасці з гуманітарыямі наогул. Гістарычная інфармацыя настолькі спецыфічна, што патэнцыяльным спажыўцом яе з'яўляецца кожны член грамадства. Для адных атрыманне гістарычнай інфармацыі неабходна як крыніца свядомай творчасці, для акумулявання ведаў, прафесійнай дзейнасці. Для другіх атрыманне гістарычнай інфармацыі не звязана з прафесійнай дзейнасцю, мае часовы характар. Патрэбнасці спажыўцоў першай групы акрэслены спецыфікай прадметнай галіны і відам іх дзейнасці. Галаўко Г.В. прапанавана мадэль інфармацыйных патрэбнасцей, агульная для ўсіх спецыялістаў-гуманітарыяў. На наш погляд, у аснову стварэння мадэлі патрэбнасцей спажыўцоў у гістарычнай інфармацыі, як і гуманітарыяў наогул, можна пакласці схему, прапанаваную вышэйназваным аўтарам, дзе вызначаюцца наступныя звёны: від дзейнасці, характар матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца ў рабоце, дакументы, якія ствараюцца ў выніку работы.

На нашу думку, вылучаюцца наступныя віды дзейнасці, якія абумоўліваюць пастаянную патрэбнасць у гістарычнай інфармацыі: навукова-даследчая, выкладчыцкая, вучэбная, папулярызатарская, інфармацыйная. Склад матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца у рабоце, уключае ўсю тыпа-відавую структуру гістарычнай літаратуры, усе віды гістарычных крыніц, незалежна ад формаў існавання. Асаблівасці колькасных і якасных паказчыкаў выкарыстання матэрыялаў залежаць ад віду дзейнасці спажыўца, ад узроўню прафесійнай падрыхтоўкі і інш. Тэматыка патрэбнасцей залежыць ад накірункаў праводзімых даследаванняў. Яна можа быць агульнагістарычнай, галіновай, праблемнай, па асобных гістарычных перыядах, падзеях, асобах і г.д. Вынікам выкарыстання гістарычнай інфармацыі з'яўляецца напісанне манаграфій, дысертацый, дакладаў, артыкулаў, дыпломных і курсавых праектаў, рэцэнзій, метадычных распрацовак, інфармацыйных матэрыялаў, гісторыка-мастацкіх твораў.

Даследаванне патрабаванняў спажыўцоў (у залежнасці ад відаў іх дзейнасці, тэматыкі патрэбнасцей) дазволіць выпрацаваць крытэрыі адбору дакументаў у выданнях бягучага і рэтраспектыўнага, навукова-дапаможнага і рэкамендацыйнага бібліяграфічнага інфармавання.

Зыгмантовіч С.В.,
канд. пед. навук,
дацэнт
Саітава В.І.,
канд. пед. навук,
дацэнт

## РЭКАМЕНДАЦЫЙНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ: ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДЫЧНЫЯ ПЫТАННІ

У Беларусі здзяйсняюцца актыўныя працэсы фарміравання інфармацыйнай інфраструктуры. Набіраюць тэмп і аб'ём адны інфармацыйныя патокі, скарачаюцца, знікаюць другія. Бібліятэчна-бібліяграфічныя цэнтры, на чале з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (НББ), імкнуцца ствараць і ажыццяўляць сучасную, разлічаную на перспектыву інфармацыйную палітыку. Адным з яе актуальных напрамкаў з'яўляецца абгрунтаванне значэння і месца рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі (РБІ).

Вакол рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў апошнія гады ішлі дыскусіі па тэарэтыка-метадычных пытаннях. Прычыны і характар негатыўных з'яў, звязаных з уплывам на РБІ дагматычнай ідэалогіі, сталі прадметам аналізу ў навуковых і метадычных публікацыях. Асабліва жыватворным з'явіўся працэс, распачаты у Дзяржаўнай бібліятэцы Расіі, накіраваны на адраджэнне дэмакратычных, асветніцкіх традыцый і творчую распрацоўку функцыянальна-метадычных сродкаў РБІ. Рэкамендацыйная бібліяграфія ў мінулым і сёння дэманструе свае шырокія магчымасці інфармаваць аб дакументах і папулярызаваць веды, інтэграваць элементы іншых відаў інфармацыі, напрыклад фактаграфічнай, рэфератыўнай. У складаных матэрыяльных умовах, пераадольваючы перапоўненасць кніжнага рынку няякаснай літаратурай, бібліятэкі стварылі такія дапаможнікі, якія сведчаць аб павышэнні ўвагі да асобы будучага чытача, псіхалагічных аспектаў чытання і выкарыстання інфармацыі.

У Беларусі рэкамендацыйна-бібліяграфічная дзейнасць на працягу многіх дзесяцігоддзяў вызначалася добрай арганізаванасцю, пастаянным пошукам задавальнення інфармацыйных патрэб, накіраванасцю на прапаганду здабыткаў нацыянальнай культуры. У існуючых умовах для шэрагу бібліятэк рэспублікі, якія былі традыцыйнымі цэнтрамі рэкамендацыйнай бібліяграфіі, прыярытэтнымі сталі прафесіянальныя і навуковыя інтарэсы чытачоў. Спецыфічнасць сферы прыкладання РБІ: непрафесійныя, агульнаадукацыйныя запыты – патрабуюць глыбокага разумення правоў чалавека на атрыманне інфармацыі ў фарміруючымся інфармацыйным грамадстве. Такую пазіцыю займае НББ. Гэта бібліятэка ажыццяўляе сучасную канцэпцыю РБІ, для якой прыярытэтнымі з'яўляюцца праблемы азнаямлення чытачоў з лепшай у пазнавальным і мастацкім сэнсе айчыннай і замеж-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ